Ж.Ю. Клімянок (Минск, БГУ)

АДЛЮСТРАВАННЕ СПАЛУЧАЛЬНАСНЫХ УЛАСЦІВАСЦЕЙ У БЕЛАРУСКІХ СЛОЎНІКАХ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТЭМАТЫЧНАЙ ГРУПЫ СМАКАВЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ)

Слоўнікавы артыкул змяшчае ў сабе інфармацыю пра рознабаковыя характарыстыкі слова, інфармуе не толькі пра яго парадыгматычныя сувязі, але і пра сінтагматычныя магчымасці лексемы. Паводле Шведавай гэты своеасаблівы лінгвістычны жанр вырашае адразу дзве задачы, звернутыя да розных адрасатаў: «адну — для тых, хто шукае інфармацыю менавіта пра само слова; іншую — для тых, каго цікавіць тыпалогія слоўных атачэнняў» [4, с. 420].

Спалучальнасныя магчымасці моўных адзінак з'яўляюцца адным з цэнтральных аб'ектаў вывучэння не толькі ў лексікаграфіі. Спалучальнасць — надзвычайна важная характарыстыка лексемы. «Як паказваюць апошнія даследаванні — Ю.Д. Апрэсяна, В.Н. Тэліі, Ф.А. Літвіна, Л.О. Чарнейка і інш., — яна дазваляе з вычарпальнай паўнатой, да апошніх «закуткаў», прадставіць семантычную структуру слова і, суадносна, яго месца ў лексіконе» [2, с. 5]. Такім чынам, значэнне слова ў слоўніку і яго спалучальнасныя ўласцівасці цесна ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Менавіта таму лексіколагі, спецыялісты, якія займаюцца прыкладной лінгвістыкай, этналінгвісты і студэнты, якія вывучаюць рускую мову як замежную, актыўна выкарыстоўваюць «Словарь сочетаемости слов русского языка». Каб прасачыць, наколькі поўна і ўсебакова семантычная структура слова адлюстравана ў слоўнікавым артыкуле дадзенага выдання, звернемся да аднаго з прыкладаў:

Слоўнікавы артыкул з прыметнікам «сладкий» у якасці загаловачнага слова пабудаваны наступным чынам: спачатку падаецца пералік граматычных форм прыметніка, затым — тлумачэнне лексічнага значэння. Далей змяшчаюцца словы, якія могуць спалучацца з загаловачнай лексемай, згрупаваныя не толькі фармальна, а і па сэнсавай і тэматычнай блізкасці. Салодкімі могуць быць у прамым значэнні: ежа (*мёд, варенье, соус*), напой (*сок, чай, кофе*), у пераносным значэнні — напрыклад, эмацыйны ці фізічны стан чалавека (*сон, грёзы, воспоминания*), назвы частак цела і міміка (*улыбка, глазки*) і пад. Такім чынам, з загаловачным прыметнікам могуць спалучацца не толькі асобныя словы, але цэлыя групы слоў, упарадкаваныя ў сістэме мовы паводле лексіка-семантычных прыкмет.

Аўтар слоўніка вылучае таксама яшчэ некалькі пазіцый, неабходных для апісання спалучальнасных уласцівасцей любога прыметніка. Сярод іх:

1) спалучэнні, у якіх прыметнік з'яўляецца кіруючым словам;

2) спалучэнні, якія ўтвараюцца ўжываннем прыметніка з неадасобленымі коскамі ўстойлівымі параўнальнымі зваротамі са злучнікам *як* (*сладкий как конфета*);

3) спалучэнні прыметніка з прыслоўямі, якія прымыкаюць да яго (*необычайно сладкий*);

4) спалучэнні прыметніка з кіруючымі ім дзеясловамі (*казаться сладким*);

5) формула сказа, якая паказвае магчымасць ужывання ў ролі выказніка поўнай формы прыметніка ў назоўным склоне або яго кароткай формы (*дыня сладкая и сочная.*);

6) найбольш ужывальныя спалучэнні прыслоўя, утворанага ад данага прыметніка, з дзеясловамі, іншымі прыметнікамі, іншымі прыслоўямі (*чересчур сладко*) [3, с. 12].

Як бачна, аўтары слоўніка пры яго складанні прытрымліваліся вузкага (граматычнага) падыходу ў разуменні спалучальнасці як «уласцівасці слова ўступаць у рознатыповую сінтаксічную сувязь з іншымі словамі» [1, с. 54]. Такі падыход да апісання спалучальнасці ў найбольшай ступені адпавядае практычным (лексікаграфічным) задачам і мэтам і ўлічвае наступныя пазіцыі:

а) вызначэнне здольнасці слова ўдзельнічаць ў розных сінтаксічных структурах (вызначэнне яго валентнасці);

б) ацэнка і класіфікацыя сінтактыка-семантычных сувязей, якія складаюць валентнасць слова з пункту погляду іх трываласці, абавязковасці, цэнтральнасці [1, с. 54].

Трэба адзначыць, што да сёння слоўнік спалучальнасці слоў беларускай мовы не складзены, разам з тым, існуе пільная неабходнасць у такім выданні. Вырашаючы дадзеную праблему, пры складанні слоўніка спалучальнасці, як і пры складанні любога іншага моўнага слоўніка, абавязкова трэба выкарыстоўваць: 1) матэрыялы ўжо існуючых лексікаграфічных прац; 2) тэксты мовы.

Прадметам нашага даследавання сталі асаблівасці адлюстравання спалучальнасці смакавых прыметнікаў у беларускіх лексікаграфічных выданнях: тлумачальных, перакладных, сінанімічных, антанімічных і некаторых іншых слоўніках[1]. Прычынай выбару тэматычнай групы менавіта прыметнікаў смаку з'явілася, па-першае, частотнасць выкарыстання лексем, якія ў яе ўваходзяць, па-другое, тое, што дадзеная група з'яўляецца семантычна значымай, значнай па складзе і валодае шырокімі сувязямі са смежнымі ТГ.

---

[1] У працы былі выкарыстаны матэрыялы слоўнікавых артыкулаў: 1) Словаря сочетаемости слов русского языка : Около 2500 словарных статей / Под ред. Денисова П. Н., Морковкина В. В. Изд. 2-е испр. — М., 1983. — 688 с.; 2) Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы: у 5 т. / рэдкал.: К. Атраховіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 1977; 4) Русско-Белорусского словаря: В 3 т.: А — Л/АН Беларуси, Ин-та языкознания им. Я. Коласа. — Мн., 1994; 5) Слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў. М. К. Клышка. — Мн.: ПУП «Радыёла-плюс», 2005. — 672 с.; 6) Слоўніка лексічных формаў (сінонімы, амонімы, антонімы, паронімы, амографы, амафоны) / Уклад. Я. І. Хвалей, У. В. Шарпіла. — Мн.: Парадокс, 2004. — 416 с.; 7) Слоўніка фразеалагізмаў. У 2 т. / І. Я. Лепешаў. — Мн. : Беларус. Энц. імя П. Броўкі, 2008; 8) Славянского ассоциативного словаря: русский, белорусский, болгарский, украинский / Н. В. Уфимцева, Г. А. Черкасова, Ю. Н. Караулов, Е. Ф. Тарасов. — М., 2004. — 800 с.

На пачатковым этапе даследавання намі было выбрана 6 базавых прыметнікаў смаку: *салодкі*, *кіслы*, *горкі*, *салёны*, *востры*, *прэсны*. Выкарыстоўваючы матэрыялы сучасных беларускіх моўных слоўнікаў, мы прасачылі ў якой ступені ў іх адлюстраваны спалучальнасныя ўласцівасці дадзеных прыметнікаў па аналогіі з пазіцыямі, прапанаванымі Маркоўкіным, Дзянісавым.

Акадэмічны руска-беларускі слоўнік пад рэдакцыяй К. Крапівы падае прыклады пераважна з адным відам сувязі: канструкцыі «прыметнік + назоўнік» у прамым і перасносным значэнні для ўсіх загаловачных прыметнікаў, акрамя слова «прэсны» (*горькая пилюля — горкая пілюля*; *горький опыт — горкі вопыт*; *кислое молоко — кіслае малако*; *кислая улыбка — кіслая ўсмешка*). Між іншым, лінгвістамі было заўважана, што «фіксаваная арыентацыя [прыметніка] на назоўнік не пакідае месца для сумненняў: найбліжэйшая сувязь прыметніка — сувязь з дапасаваным назоўнікам» [1, с. 55]. У заромбавай частцы артыкула слоўніка прадстаўлены прыклады ўстойлівых спалучэнняў з кампанентам «наз. + прым.» (тыпу *хуже горькой редьки — горш за горкую рэдзьку*; *горе горькое — гора горкае*), таксама нададзена ўвага спецыяльным тэрмінаспалучэнням (*кислая соль* (хим.) — *кіслая соль*).

Аўтары тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы шырока выкарыстоўваюць прадстаўленую ў мове і, у прыватнасці, у слоўніку спалучальнасці канструкцыю «прым. + наз.» з мэтай ілюстрацыі словаўжывання смакавых прыметнікаў. Прыклады такіх словаспалучэнняў змешчаны для кожнага з шасці аналізуемых слоў са значэннем прыкметы смаку (*прэсная страва*; *прэсныя жарты*; *салёныя грыбы*; *кіслая капуста і пад.*). Атрыбутыўныя канструкцыі ў спецыяльным значэнні (*кіслая глеба* — ‘*якая змяшчае кіслату*’) і ў фразеалагічным ужыванні (*горкае дзіця* — ‘*наіўны, нявопытны чалавек*’) з’яўляюцца абавязковым складнікам слоўнікавага артыкула ў выпадку, калі загаловачны прыметнік валодае спецыфічнымі спалучальнаснымі магчымасцямі. Словаспалучэнне прыслоўя, утворанага ад загаловачнага прыметніка, з інфінітывам сустракаецца толькі аднойчы (*Не соладка* (прысл.) *жывецца сіраце*.) і з’яўляецца хутчэй адзнакай слоўніка спалучальнасці, чым тлумачальнага.

Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў адлюстроўвае парадыгматычныя ўласцівасці прыметнікаў «горкі» і «салодкі», а менавіта паказвае іх магчымасці замяняцца ў пэўным кантэксце сінанімічнымі лексемамі ці словазлучэннямі. Так, прыметнік «горкі» можа замяняцца лексемай «ёлкі» ў кантэксце, калі гаворыцца пра тлушч (*ёлкае сала*). Слоўнікавы прыклад дэманструе абмежаваную спалучальнасць прыметніка, які можа характарызаваць нешматлікі рад назоўнікаў — гэта словы, якія маюць у сваім значэнні сему «тлучш». У парадыгматычныя адносіны са словам *салодкі* ў пераносным значэнні ўступае лексема *мядовы*, са словам *горкі* — дзве лексемы: *палыновы* і *як чэмер* (*Як чэмер — капуста, заціркa — без солі* (Я. Купала), — *‘горкая капуста’*).

Сінтагматычныя ўласцівасці прыметнікаў смаку можна прасачыць і на матэрыяле артыкулаў слоўніка фразеалагізмаў (*асіна горкая плача*; *горкая пілюля*; *піць горкую чашу да дна*; *на горкі яблык і пад.*). Такія ёмістыя і выразныя словаспалучэнні ўзбагачаюць штодзённае маўленне. У фразеалагізмах сінтаксічная сувязь паміж кампанентамі найбольш моцная, і такія канструкцыі з'яўляюцца ўзнаўляльнымі, камунікатыўнымі.

Дадзеныя славянскага асацыятыўнага слоўніка паказваюць, што прыметнікі часта бываюць словам-рэакцыяй на стымул назоўнік або дзеяслоў (*дзіця →горкае*; *піць → горкую*; *хлеб, падман, голас → салодкі*). «У сваёй сукупнасці яны [найбольш частотныя рэакцыі] адлюстроўваюць усю разнастайнасць сувязей слова з яго суседзямі па лексічнай сістэме і — адначасова — усю яго семантычную структуру» [2, с. *6*].

Прааналізаваныя слоўнікавыя артыкулы, такім чынам, змяшчаюць інфармацыю пра слоўныя атачэнні (міні-кантэксты) аналізуемых прыметнікаў смаку ў выглядзе прыкладаў словаспалучэнняў іх з назоўнікамі ці, зрэдку, з прыслоўямі, утворанымі ад прыметнікаў, або з дзеясловамі. Найбольш шырока прадстаўлены канструкцыі «прым. + наз.», паколькі дастаткова поўна адлюстроўваюць найбольш тыповы і пашыраны від сінтактыка-семантычнай сувязі прыметнікаў смаку.

Такім чынам, матэрыялы ўжо існуючых лексікаграфічных прац як найважнейшыя крыніцы інфармацыі аб сінтагматычных і парадыгматычных уласцівасцях слова ў будучым павінны стаць падмуркам для стварэння беларускага слоўніка спалучальнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Морковкин, В.В. Идеографические словари / М., 1970.

2. Норман, Б.Ю. Проблема «Язык. Словарь. Текст» в исследованиях кафедры теоретического и слав. языкознания [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.bsu.by/ Cache/pdf/227573.pdf. — Дата доступа: 13.03.2012.

3. Словарь сочетаемости слов русского языка: около 2500 словарных статей / под ред. Денисова П.Н., Морковкина В.В. — 2-е изд. испр. — М., 1983.

4. Шведова, Н.Ю. Парадоксы словарной статьи. Русский язык. Избранные работы. — М., 2005.